


Руіны Лідскага замка. 1929.

Землякі Я. Драздовіча помняць яго і разьбяром па дрэву, і настаўнікам, і шчырым дарадцам. А маляваныя дываны, створаныя нястомнымі рукамі дзядзькі Язэпа, і зараз можна сустрэць у вясковых хатах Глыбоччыны.

Сродкі ад продажу буклета пойдуць у фонд будаўніцтва помніка і музея Я. Драздовіча ў Мінску.

АТ 19086. Подп. к печ 11. 10. 88. г.

Минск. Тип. БГУ. 1988 г. Зак. 2251, т. 3000.

Кошт — 20 кап.



ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ

ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ

(1888 — 1954)

У сучасным беларускім мастацтве Язэп Драздовіч — асоба самабытная, шматгранная, дагэтуль неспазнаная. Ён быў графікам, жывапісцам, разьбяром, пісьменнікам, збіральнікам фальклору, археолагам, настаўнікам.

Нарадзіўся Язэп Нарцызавіч Драздовіч 1(13) кастрычніка 1888 г. у засценку Пунькі Дзісенскага павета Віленскай губерні. Першапачатковую адукацыю атрымаў ў Дзісне, ў 1906 — 10 гг. вучыўся ў Віленскай мастацкай школе праф. І. Трутнева. Станаўленне і першыя крокі Я. Драздовіча ў мастацтве прыпадаюць на гады адраджэння беларускай культуры і цесна звязаны з творчай працай Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алаізы Пашкевіч, Ядвігіна Ш., Ігната Буйніцкага, Антона Грыневіча.

Першыя датаваныя творы мастака — афармленне вокладкі «Беларускага каляндара на 1910 г.», першай кнігі беларускай паэтэсы К. Буйлы «Курганная кветка» (1914 г.).

У 1926 — 30 гадах Я. Драздовіч — выкладчык Віленскай, Навагрудскай беларускіх гімназій. Штолета мастак вандруе па Беларусі, пасля чаго нараджаюцца графічныя серыі, альбомы, акварэлі, з якіх жыва паўстаюць беларускія краявіды, выдатныя помнікі дойлідства ў Вільні, Троках, Лідзе, Навагрудку, Міры, іншых старажытных мясцінах роднага краю.

У 1930 г. польскія ўлады закрываюць Навагрудскую гімназію і з гэтага моманту да апошніх сваіх дзён Драздовіч — вольны мастак, знаёмы і блізкі працоўнаму люду дзядзька Язэп.

Я. Драздовіч адзін з першых у беларускім мастацтве шукае вытокі гісторыі народа. Вобразы Францыска Скарыны, Усяслава Чарадзея, Баяна, сівая мінуўшчына Полацкай зямлі, уваскрэсшая на палотнах, — гэта святая памяць і любоў мастака.

Ненатольная прага спазнаць Сусвет выяўляецца ў творах касмічна-фантастычнай тэматыкі: «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Месяцы», «Жыццё на Сатурне». І ў навукова-папулярнай кнізе «Нябесныя бегі» (1931, г. Вільня) мастак спрабуе адкрыць сваёй інтуіцыяй, фантазіяй таямніцу нябёс.

Рупліва працаваў Я. Драздовіч у Віленскім беларускім музеі, папаўняючы яго археалагічнымі знаходкамі, этнаграфічнымі занатоўкамі, творамі народнага мастацтва. Тут знайшлі ганаровае месца і шмат якія творы самога майстра.



Нірвана. 1925.



Пагоня 1921